*І.А.Шупенька, вядучы*
*навуковы супрацоўнік*

# КНІГА Ў СІСТЭМЕ МУЗЕЙНА-ПЕДАГАГІЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

Музей беларускага кнігадрукавання ў Полацку з'яўляецца адным з адзінаццаці музеяў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Размяшчаецца ў памяшканні былой брацкай школы Полацкага Богаяўленскага манастыра. Свае дзверы для наведвальнікаў адчыніў 8 верасня 1990 г. падчас святкавання 500-годдзя з дня нараджэння Францыска Скарыны. Галоўнае месца ў ім належыць кнізе, і паказана яна як неад'емная частка гісторыка-культурнага працэсу, як складаная з'ява, што адначасова належыць матэрыяльнай і духоўнай сферам дзейнасці чалавека.

Музею сваім размяшчэннем і прызначэннем наканавана несці і захоўваць слова і справу Францыска Скарыны. І, безумоўна, што вялікая частка экспазіцыі прысвечана нашаму славутаму земляку, асвятленню яго жыцця і дзейнасці, яго кнігам.

Экспазіцыя музея пабудавана па тэматычным прынцыпе і разлічана на розныя катэгорыі наведвальнікаў. Для ўзмацнення эмацыянальнага ўздзеяння, большай выразнасці ў экспазіцыю ўведзены рэканструяваныя майстэрня перапісчыка кніг, друкарня XYII–XYIII стст, майстэрня мастака-афарміцеля кніг.

Экспазіцыя музея пабудавана такім чынам, што мы маем магчымасць выкарыстоўваць розныя формы работы з наведвальнікамі. Гэта не толькі правядзенне аглядных і тэматычных экскурсій, але і музейна-педагагічныя заняткі для дзяцей. Такія заняткі праводзяцца ў рамках запаведніка ўжо на працягу дзесяці гадоў. Тэматыка іх самая разнастайная. Аддзел музейнай педагогікі запаведніка займаецца вызначэннем тэматычных кірункаў, а кожны канкрэтны музей распрацоўвае свае профільныя праграмы ў адпаведнасці з тэматыкай экспазіцыі.

Супрацоўнікамі Музея беларускага кнігадрукавання распрацаваны некалькі праграм. Кожная з праграм разлічана на пэўную ўзроставую катэгорыю. Правядзенне заняткаў каардынуецца з гарадскім аддзелам адукацыі, са школамі горада, узгадняецца з кожным канкрэтным настаўнікам. Заняткі праходзяць у памяшканні музея. У залежнасці ад тэмы заняткаў мы вызначаем залу музея для іх правядзення. Эмацыянальнаму ўздзеянню

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

спрыяюць атмасфера залы, музейныя прадметы ў ёй, васковыя фігуры перапісчыка кніг, наборшчыка і друкара ў рэканструяваных майстэрні перапісчыка і друкарні. Заняткі праводзяцца адзін раз у месяц для кожнай канкрэтнай групы. Вучні прыходзяць на іх разам са сваімі настаўнікамі, часам і з бацькамі. Зараз у нашым музеі вывучаюцца паралельна некалькі праграм. Пэўную праграму вядзе той ці іншы супрацоўнік, які працуе з адной і той жа групай на працягу аднаго або двух гадоў.

Для самых юных наведвальнікаў у рамках агульнай праграмы цыкла "Вы прыйшлі ў музей" праводзяцца заняткі-падарожжы пад назвай "Кніга як помнік духоўнай культуры". На гэтых занятках мы не толькі робім падарожжа па музеі, расказваючы аб з'яўленні першых кніг і іх гістарычным шляху, пра розныя формы кнігі і матэрыялы, на якіх некалі пісалі людзі, але і паказваем некаторыя прадметы, даём магчымасць дзецям да іх дакрануцца. У заключнай частцы раскрываем выключную ролю кнігі сёння, паказваем кнігі сучасныя.

Цыкл заняткаў "З кнігай праз стагоддзі і краіны" разлічаны на два гады і праводзіцца для вучняў 3–4 класаў. Тэматыка іх наступная.

Першы год навучання

1. З глыбіні стагоддзяў (дакніжныя формы пісьменнасці)
2. Кнігі нашых продкаў
3. З гісторыі папяровага ліста
4. Зробім кнігу самі (практычныя заняткі)
5. У цішыні скрыпторыя
6. Аздабленне рукапіснай кнігі
7. Палата кнігапісная
8. Абагульняючыя заняткі-гульня "Падарожжа ў краіну зачараванай кнігі"

Другі год навучання

1. Падарожжа да крыніц кнігадрукавання
2. Беларускі першадрукар
3. Кнігі Францыска Скарыны
4. Францыск Скарына і сучаснасць
5. Мастак і кніга
6. Разнастайнасць друкаванай прадукцыі
7. У сучаснай друкарні
8. Абагульняючыя заняткі-гульня "Па таямнічых месца чароўнага кніжнага свету".

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Наступны цыкл заняткаў "Падарожжа з кніжнай закладкай" распрацаваны для вучняў чатырох класаў і разлічаны на адзін год.

Праграма "У дапамогу настаўніку беларускай літаратуры" адрасавана вучням дзесятых класаў.

У 2004 г. у Полацкім гарадскім аддзеле адукацыі было прынята рашэнне аб правядзенні тэматычных заняткаў па курсу "Полацказнаўства" для паглыбленага вывучэння гісторыі Полацка і Полацкай зямлі. Заняткі праводзяцца сумесна ў школах і музеях. Тэматыка заняткаў непасрэдна звязана з вучэбнай праграмай. Праводзяцца яны для вучняў 5–6 і 9–11 класаў. У кожным з музеяў у залежнасці ад напрамку работы праводзяцца заняткі на пэўныя тэмы. І, зразумела, што тыя заняткі, якія праводзяцца ў музеях і тэматычна суадносяцца з канкрэтнай экспазіцыяй і экспанатамі, больш эфектыўныя, чым тыя, што праводзяцца ў школе.

Асноўныя мэты музейна-педагагічных заняткаў у Музеі беларускага кнігадрукавання наступныя:

1. Пазнаёміць вучняў з гісторыяй кніжнай і друкарскай справы (на аснове экспазіцыі Музея беларускага кнігадрукавання).

2. Развіваць эмацыянальную сферу асобы, яе здольнасці.

3. Фарміраваць наглядна-вобразнае і лагічнае мысленне на базе назіранняў за музейнымі прадметамі.

4. Паказаць выключную ролю і значэнне кнігі ў сучасным грамадстве.

5. Выхоўваць беражлівыя адносіны да кнігі і павагу да працы людзей паліграфічных прафесій.

6. Выхоўваць любоў да роднага краю, горада, пачуцці патрыятызму і гонару за свой горад і славутых землякоў.

Правядзенне заняткаў у рамках праграм спрыяе паслядоўнаму і лагічнаму ўспрыманню матэрыялу, больш поўнаму і грунтоўнаму яго засваенню.Нашы заняткі – гэта адметная форма работы з дзецьмі. Пры правядзенні тэматычнай экскурсіі мы будуем расказ у залежнасці ад размяшчэння прадметаў, прытрымліваючыся той лагічнай паслядоўнасці, якая прадугледжана экспазіцыяй. Падчас заняткаў адбываецца непасрэдны кантакт паміж супрацоўнікамі і дзецьмі. Для лепшага ўспрымання і засваення тэм супрацоўнікі рыхтуюць табліцы, схемы і інш. Невядомыя словы і новыя паняцці выпісваюцца на дошцы, затым тлумачацца. Падчас заняткаў выкарыстоўваюцца музычныя запісы, слайды, відэакасеты.

Кожная тэма па-свойму цікавая, але ёсць заняткі, якія найбольш падабаюцца дзецям, уражваюць іх сваёй незвычайнасцю і

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

таямнічасцю. Цікава і змястоўна праходзяць заняткі, прысвечаныя кнігам нашых продкаў, рукапіснай кнізе, першым друкаваным кнігам, Францыску Скарыне. І, зразумела, што на кожных занятках асноўнае месца належыць кнізе. Мы не толькі паказваем кнігу як неад'емную частку гістарычнага і культурнага працэсу ў сучасным свеце і ў гістарычным мінулым, паказваем ўсе структурныя элементы кнігі, але і спрабуем зрабіць яе самі разам з дзецьмі. Дзеці з натхненнем падыходзяць да гэтай справы, робячы кнігу па ўсіх правілах і выкарыстоўваючы розныя варыянты яе аздаблення, розныя матэрыялы для ўпрыгожвання вокладкі. Часам здзіўляюць і ўражваюць тыя фантазія і разнастайнасць, якія можна ўбачыць у зробленых сваімі рукамі кнігах. Затым ў створанай імі ж кнізе вучні пачынаюць пісаць сапраўдным гусіным пяром, якое для іх падрыхтавалі супрацоўнікі музея. Дзеці нават спрабуюць сябе ў ролі перапісчыкаў, друкароў, ілюстратараў кнігі.

На нашых сустрэчах мы заўсёды падкрэсліваем, што, нягле-дзячы на развіццё розных сродкаў масавай інфармацыі, камп'ютэрных тэхналогій, кніга была і застаецца асноўнай крыніцай ведаў, той крыніцай, з якой не адно пакаленне чэрпае веды, вучыцца пазнаваць свет. Таму трэба шанаваць і берагчы кнігу, захоўваць яе для нашчадкаў. Зацікаўленасць дзяцей з'яўляецца яскравым пацвярджэннем неабходнасці праводзімых заняткаў. Музейна-педагагічныя заняткі з'яўляюцца дзейснай і эфектыўнай формай выхавання падрастаючага пакалення.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ